ISSN 1024-5928 (print)

## *ЛІТАРАТУРАЗНАЎСТВА*

LITERARY SCIENCE

УДК 821.161.3.09-1«1921/1939»

Паступіў у рэдакцыю 02.05. 2017
Received 02.05.2017

**М. У. Мікуліч**

*Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі, Мінск, Беларусь*

# ПАЭЗІЯ ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ: НЯВЫВУЧАНЫЯ СТАРОНКІ

**Аннотация.** Анализируются неизученные страницы западнобелорусской поэзии 20–30-х гг. XX века, идейно-эстетические поиски А. Дубровича, В. Козловщика, В. Адважного. Творчество А. Дубровича рассматривается в контексте традиций лирико-повествовательного стилевого течения, которому были свойственны естественность художественного мировосприятия и мышления, сочетание общего и отдельного, объективного и субъективного. Отмечается, что стихи А. Дубровича выстраивались в соответствии с повествовательным принципом, обращали на себя внимание аспектами эпической развернутости рисунка, очерковости и публицистичности, предметной конкретности художественной образности. В. Козловщик был представителем ведущего в поэзии Западной Беларуси романтического стилевого течения. Его произведения определялись острым конфликтом между лирическим героем и действительностью, они утверждали особенности национально-возрожденческой доктрины, героико-патриотический дух, культивировали решительность, напор, силу. Прослеживается их заангажированность в национально-историческую проблематику, романтически-идеализированная образность. В творчестве В. Адважного, представителя духовно-иррационального стилевого течения, акцентируется поэтизация основ мистического эволюционизма. Его лирическое сознание было обращено к христианскому первоисточнику, утверждению идеального начала мира, восславлению веры в Бога как безбрежное и вечное Добро и Счастье. Раскрываются особенности общественно-патриотического и христианско-религиозного идеала поэта.

**Ключевые слова:** традиционный, поэзия, творческая индивидуальность, национальное сознание, менталитет, романтический, стилевое течение, влияние

**Для цитирования:** Мікуліч, М. У. Паэзія Заходняй Беларусі: нявывучаныя старонкі / М. У. Мікуліч // Вес. Нац. акад. навук Беларусі. Сер. гуманіт. навук. – 2017. – № 4. – С. 90–100.

**M. U. Mikulich**

*Belarusian Culture, Language and Literature Research Centre, National Academy of Sciences of Belarus, Minsk, Belarus*

## POETRY OF WESTERN BELARUS: UNSTUDIED PAGES

**Abstract.** The article explores 'unstudied pages' of the Western Belarusian poetry of the 1920s–1930s and the quest for ideology and aesthetics by A. Dubrovich, U. Kazloushchyk, and V. Advazhny. A. Dubrovich's works are addressed in the context of traditions pertinent to the lyrical and narrative style characterized by an unforced artistic worldview, a combination of the general and individual and of the objective and subjective. It is noted that A. Dubrovich's poems were arranged in accordance with the narrative principle; they attracted attention due to such their aspects as epically unfolded pattern, sketchiness and publicism, and substantive concreteness of artistic imagery. U. Kazloushchyk was a representative of the romantic style that dominated in the poetry of Western Belarus. His works were marked by acute conflict between the lyrical hero and reality; they asserted specific features of the national revival doctrine and the heroic and patriotic spirit, and cultivated resoluteness, persistence, and strength. The article reveals their excessive involvement in the issues of national history and their romanticized imagery. It is noted that the works by V. Advazhny who represents the spiritually irrational stylistic trend, poeticize the foundations of mystical evolutionism. His lyrical consciousness addressed the Christian primary source, asserted the ideal beginning of the world, and glorified the faith in God as boundless and eternal Good and Happiness. Specific features of the poet's social, patriotic and Christian ideal are identified.

**Keywords:** traditional, poetry, creative individuality, national consciousness, mentality, romantic, stylistic trend, influence

**For citation:** Mikulich M. U. Poetry of Western Belarus: Unstudied Pages. *Vestsi Natsyianal'nai akademii navuk Belarusi. Seryia humanitarnykh navuk = Proceedings of the National Academy of Sciences of Belarus. Humanitarian series,* 2017, no 4, pp. 90–100 (in Belarusian).

© Мікуліч М. У., 2017

Развіццё паэзіі Заходняй Беларусі (1921–1939) вызначалася ўзаемадзеяннем трох мастацка-стылявых плыней – лірыка-апавядальнай, рамантычнай і духоўна-ірацыянальнай. Да лірыка-апавядальнай плыні належалі, напрыклад, Міхась Васілёк, Міхась Машара, Мікола Засім, Ніна Тарас і інш., да рамантычнай адносіліся Уладзімір Жылка, Максім Танк, Піліп Пестрак, Валянцін Таўлай, да духоўна-ірацыянальнай – Казімір Сваяк, Наталля Арсеннева, Хведар Ілляшэвіч, Пётр Сяўрук… Тыповымі прадстаўнікамі адзначаных плыней з'яўляліся таксама адпаведна Алесь Дубровіч, Уладзіслаў Казлоўшчык і Вінцук Адважны, ідэйна-мастацкія пошукі якіх амаль не вывучаліся нашым літаратуразнаўствам.

Творчасць прадстаўнікоў лірыка-апавядальнай стылявой плыні сведчыла пра натуральнасць мастацкага светаўспрымання і мыслення, спалучэнне агульнага і асобнага, аб'ектыўнага і суб'ектыўнага, калектыўнага, масавага і асабістага. Яна звяртала на сябе ўвагу вастрынёй сацыяльнага погляду, сцвярджэннем ідэй грамадзянскай актыўнасці, барацьбы супраць несправядлівасці і прыгнёту, глыбокім раскрыццём шчырага свету чалавечай душы, багацця і разнастайнасці яе ўяўленняў і перажыванняў. Тут лірычна пранікнёны аналіз працэсаў грамадскага развіцця дапаўняўся іх сацыяльна-маральнай, а часам і духоўна-псіхалагічнай выверкай. У ёй выразна адчувалася ўстаноўка на актыўнасць і насычанасць унутранага асваення рэчаіснасці, эмацыянальна напоўненае жыццё, паказ індывідуальных адносін да падзей і фактаў, самавыяўленне, спавядальнасць і інш.

Паэты гэтай стылявой арыентацыі будавалі свае творы па прынцыпу рэалістычнага самаруху жыцця, калі ў іх рамках адбываліся пэўныя падзеі, разгортваліся сітуацыі, развіваліся адносіны, вырашаліся канфлікты і інш. Тут аўтар ішоў за з'яваю і фактам, раскрываючы да іх сваё стаўленне. Яго мастацкая свядомасць была забяспечана адначасова зрокам, слыхам, думкай і пачуццём. Тут лірычны сюжэт разгортваўся як тыповы лірычны час, духоўны свет героя раскрываўся як свет народнага асяроддзя, а перажыванні народнага асяроддзя раскрываліся як духоўныя перажыванні героя.

Якраз у рэчышчы гэтага мастацкага дыскурсу развівалася лірыка Алеся Дубровіча (сапр. – Аляксей Рэдзька, 1906–1942). Як і М. Васілёк, М. Машара, Г. Новік, многія іншыя паэты, А. Дубровіч напоўніцу зведаў на сабе ўздзеянне побытава-эканамічных і грамадска-сацыяльных забарон і абмежаванняў, палітычнага ўціску, за ўдзел у народным руху пратэсту Заходняй Беларусі пабываў у турэмных засценках.

Нават на аснове небагатай творчай спадчыны А. Дубровіча можна меркаваць аб тым, што ён валодаў значнымі здольнасцямі, самабытным паэтычным дарам, умеў у звычайным, будзённым, часовым, зменлівым разгледзець сутнасць з'явы ці працэсу, праз аналіз прыватнага прыйсці да разумення сэнсу падзей, раскрыць характар сацыяльных змен і зрухаў, адметныя асаблівасці грамадскага развіцця. Як і творы Г. Новік, яго вершы выяўлялі свет асобы, што жыла клопатамі і праблемамі сялянскага асяроддзя, бараніла ідэі сацыяльнай справядлівасці і свабоды, права на звычайныя чалавечыя радасці. Даволі часта яны будаваліся па апавядальным прынцыпе, звярталі на сябе ўвагу аспектамі эпічнай разгорнутасці малюнка, нарысавасці і публіцыстычнасці, прадметнай канкрэтнасці паэтычнай вобразнасці:

Зелянее на сонцы пад плотам
і шапоча маркотна крапіва,
што на вёсцы нядоля, бядота,
што так мала жывуць тут шчасліва.
Што счарсцвелага хлеба скарынка
часта ўпрочкі ідзе ад абеду;
што у місцы малая крупінка
ўсё гарцуе, не робячы следу…
…………………………………………
І шапоча крапіва, што блізка
гэны час, час з вясною расстання,
што, схіліўшыся гора к ёй нізка,
перарве яе дзён красаванне.
Што у хаце галодныя дзеці
калісь справяць над ёю памінкі:
будуць вочкі іх свечкай гарэці,
знікнуць з твару нядолі слязінкі [7, с. 370].

У вершах А. Дубровіча рэальнае з яго дэталямі і падрабязнасцямі, прадметна-рэчыўнае перапляталася з духоўна-лірычным, эмацыянальна-пачуццёвым, з ахопленасцю лірычнага героя высокімі грамадзянскімі мэтаімкненнямі. Зусім відавочна, што сюжэт лірычнага перажывання ў іх быў абумоўлены непрыняццем заходнебеларусай рэчаіснасці з яе антыдэмакратычнымі і антынароднымі законамі і парадкамі, сцвярджэннем ідэі сацыяльнай і духоўнай свабоды краю.

Як адзначаў М. Бельскі, А. Дубровіч «верыў у сілу паэтычнага слова» [2, с. 3], ён заклікаў заходнебеларускага песняра сплаціць «свой доўг вялікі», адважна кінуць у свет «Усхваляваныя напевы» з тым, «Каб новых дзён яны засевам Ўзняліся з-пад штодзённых бед. Каб хваляю на буйнай ніве Яны плылі і ўшыр і ўздоўж…» («Усхваляваныя напевы...»). Паэт сцвярджаў залежы народнага духу і веры, патэнцыял нацыянальна-вызваленчага руху, маральныя каштоўнасці змагароў за народнае шчасце, даволі часта звяртаючыся да лірыка-абагульненай вобразнасці, умоўных сродкаў мастацкай выразнасці. Думаецца, у многім яскрава і пераканаўча сведчаць пра гэта наступныя радкі (верш «Мы»):

Мы – скрыўджаных няпраўдай струны,
Адным распалёны агнём.
Мы гімн пакуце граем сумны
І славу барацьбе пяём.

Натхненне наша у змаганні
За шчасце новага жыцця,
Мы летуцім аб светлым ранні,
І шмат у песнях пачуцця.

Мы сэрцам полымным і чыстым
Асвецім шлях сябрам другім,
І верым – песняй урачыстай
Мы перамозе зложым гімн [7, с. 371].

Слова А. Дубровіча, сапраўды, гучала «рэвалюцыйна ясна» (Г. Каханоўскі), пераканаўча і важка.

Шмат у чым тыповым для мастацкіх пошукаў А. Дубровіча з’яўляецца верш «Гэй, віхор шырокакрылы…», вытрыманы ў лірычна-пранікнёным вобразна-эмацыянальным ключы. У ім лірычны герой звяртаецца да «падарожніка няпрытульнага» віхора, пытаецца ў яго, «дзе зьвіваў» ён «хмарам грывы, дзе спраўляў свой лёт разгульны?». «Раскажы, што ў сьвеце бачыў, – прапануе ён, – скрось – на захадзе й на ўсходзе, – крумкачы аб чым дзе крачуць, аб чым весткі ў сьвеце ходзяць?..»

– Быў далёка я за морам,
цалаваўся з акіянам,
на сваіх сьняговых горах
я гуляў з вясельлем п’яным, –

паведамляе віхор. «І на захадзе й на ўсходзе сьвет грыміць і звоніць стальлю… Гэй, там ёсьць чаму паўчыцца!..», – шматзначна сцвярджае ён [5, с. 224].

Лірыка-апавядальная плынь з’яўляецца найбольш даўняй і распрацаванай у нашай літаратуры, тыповай для яе, але вядучае месца ў заходнебеларускім паэзіятворчым працэсе належала рамантычнай мастацка-стылявой плыні. Тое было абумоўлена асаблівасцямі грамадска-сацыяльнага асяроддзя, разгортваннем у краі нацыянальна-патрыятычнага руху, народна-вызваленчай барацьбы. Творы прадстаўнікоў рамантычнай мастацка-стылявой плыні характарызаваліся асаблівым, рамантычна-ўзвышаным, лірычна-пранікнёным, ладам светаадчування і мыслення героя, яго абвостраным успрыманнем народных бед і няшчасцяў, праблем і супярэчнасцей грамадска-сацыяльнай рэчаіснасці, нястрымным парывам у будучыню, да ідэалаў свабоды і справядлівасці, дабра і шчасця. Яны паэтызавалі высокія духоўна-маральныя каштоўнасці жыцця, поўніліся рамантычна-ідэалізаванымі вобразамі і карцінамі, вызначаліся драматычным зместам, інтэнсіўным рытміка-інтанацыйным гучаннем.

У нацыянальна-адраджэнскім рэчышчы рамантычнай стылявой плыні паэзіі Заходняй Беларусі разгортваліся творчыя пошукі Уладзіслава Казлоўшчыка (сапр. прозвішча – Казлоўскі, 1896–1943). Гэта быў вядомы спартыўны журналіст і публіцыст, аўтар кніг «Фізічнае выхаванне грамадзян-

ства» (1927), «Аб фізічным выхаванні ў беларусаў» (1928), «Плач беларускай старонкі-маткі па дзетках сваіх рэнегатах» (1930), грамадска-палітычны дзеяч, адзін з заснавальнікаў Беларускай нацыянал-сацыялістычнай партыі. У 1932 годзе ён выдаў вершаваны раман «Путы кахання», у 1935 – зборнік вершаў «Шляхам змагання», а ў 1940 – вершаванае апавяданне «Казюк на кірмашы».

Усе ці амаль усе мастацкія творы У. Казлоўшчыка былі звернуты да выяўлення агульнай сацыяльнай эмоцыі – выкрыцця і адмаўлення свету прыгнёту і несправядлівасці. Праблемна-тэматычны змест, настрой і пафас зборніка «Шляхам змагання» вызначалі нацыянальна-вызваленчыя матывы, ідэі барацьбы, непрыняцця заходнебеларускай рэчаіснасці, з якой лірычны герой знаходзіўся ў вострых супярэчнасцях. Паэт адчуваў сябе ў мэтанакіраваным, дынамічным руху, велічным паходзе па праўду і справядлівасць, у дружнай кагорце змагароў за свабоду і незалежнасць Беларусі. «Наперад ідзём мы няўхільна і цьвёрда Шляхам змаганьня, – чытаем у праграмным вершы, якім адкрываецца зборнік. – Мы ўжо не заплачам. Ні ў болі, ні ў страху Ніхто не пачуе у нас нараканьня» («Шляхам змагання»). Яго лірычны герой пакідаў у мінулым «І стогн стагодзьдзяў І сьлёз разводзьдзе», што «Не асьвяцілі няволі ноч». Гэта спадчына, якой варта назаўсёды пазбыцца:

Ёсьць так з прадвеку,
Што чалавеку
Сьляза ня можа карыснай быць:
Хаця бы з гора
Наплакаў мора –
Ня зможа волі сабе здабыць… [6, с. 17].
(*«Наш шлях – змаганне...»*)

У вершах «Змагацца і дзеяць», «Не паддавацца» і іншых У. Казлоўшчык праводзіў паралель паміж, на яго погляд, вызначальнымі з’явамі і працэсамі, якія адбываюцца ў прыродным асяроддзі і чалавечым грамадстве, сцвярджаў думку аб тым, што «шчасьце і воля жывуць ў барацьбе». «Ці бачыў калі хто жыцьцё без змаганьня? Ці жаласьць ў прыродзе знашоў хто ў каго? Дужэйшы слабога бярэ без чаканьня…», – казаў паэт [6, с. 51]. Руху, клопату, барацьбе за сваё існаванне падпарадкавана ўсё жывое на зямлі, тое, што «ёсьць нярухліва, Бязжаласна згіне ў прыродзе, памрэ» [6, с. 51]. Задумваючыся над будучым, спрабуючы прадугледзець свае «Жыцьцёвае сьцежкі далейшы працяг», разгадаць, «якія дарожкі Прыдзецца» яшчэ прайсці, у вершы «Жыццёвы шлях» ён цвёрда заключаў наступнае: «Я знаю, што прыдзе тады мне падмога, Як будзе вясьціся мая барацьба» [6, с. 58].

Вершы У. Казлоўшчыка сцвярджалі асаблівасці нацыянальна-адраджэнскай дактрыны, героіка-патрыятычны дух, культывавалі рашучасць, напор, волю, сілу. У іх дамінавалі тэмперамент, маральная бескампраміснасць, адважны парыў у будучыню. «Тварыць трэба сілу, вясьці трэба бой», – казаў паэт, звяртаючыся да свайго «брата Крывічаніна»; «Калі будзе сіла і ў нашых руках, Дык праўда сама прыдзе нам з барацьбы…» («Сіла»). Ён цвёрда верыў, што «З курганаў вяковых, са стогну стагодзьдзяў Ускрэсьне дух волі – з трыумфам паўстане»; «І пульсам магутным забьецца ў народзе, Ахопіць змаганьнем і душы, і сэрцы…» («Дух волі»). «Раней ці пазьней» родная старонка пойдзе ў «бой аканчальны, вызвольны. Тады сьвет пачуе маланкі-грымоты З пярунаў, што пусьціць народ паднявольны» («Будзеш незалежнай»):

Няшчасныя дзеі Цябе гартавалі
І сілу давалі ў нядолі бязьмежнай –
Ты мусіш паўстаці мацнейшай ад сталі
І быць незалежнай [6, с. 8].

«Уцякай хутчэй манлівы дым, Бо ўжо ідзе крывіцкі ўздым, – чытаем у вершы «Крывіцкі дух». Ён «Ідзе з нізоў», «Жыцьцё нясе для бедната, Сьвятло для доўгай цемнаты» [6, с. 16].

Вершы У. Казлоўшчыка поўніліся рамантычна-ідэалізаванымі вобразамі долі-нядолі, бяды, праўды і крыўды, цемры-ночы, злога ярма, путаў-ланцугоў, паходу, змагання, будучыні. У іх паэтызаваліся малады дух патрыётаў, што вырываўся на свабоду, «дух волі», які «грае песьні», «бойкая моладзь – арлы маладыя», «крывіцкі ўздым», услаўляліся Крывіцкая Пагоня, якая ляціць «Праз горы, рэкі і лясы», «Крывіцкі рыцар з неба», што спяшыць «У старонку, скавану ў ланцуг, Распутаць хоча ёй Пагоню», «духа гордасьць» і «волі цьвёрдасьць», якія «Вядуць няўхільна

ў вызвольны бой» («Песня беларускай моладзі», «Пагоня», «Наш шлях – змаганне» і інш.). Дадзеная асаблівасць уласціва і яго кароткім лірычным замалёўкам, імпрэсіям у прозе «Шлях моладзі», «Прачніся, беларусе!», «Не ў нас вясна» і інш. [4, с. 177–183].

Як мы адзначылі, У. Казлоўшчык востра адчуваў нацыянальныя і сацыяльныя праблемы і беды беларускага народа, яго лірычны герой быў ахоплены ўзнёслымі грамадзянска-патрыятычнымі імкненнямі, але паэту далёка не заўсёды ўдавалася забяспечыць належны духоўна-эстэтычны ўзровень выяўлення жыццёвага матэрыялу. Многія яго вершы выглядалі як паэтычныя фармулёўкі ідэалаў, тых мэт і задач, якія ставілі перад сабою лірычны герой і яго аднадумцы, як аптымістычныя прароцтвы надыходу волі і незалежнасці. У. Казлоўшчык своеасабліва пастуліраваў актуальныя ідэі нацыянальнай і сацыяльнай свабоды Беларусі, быў скіраваны на рамантычна-адцягненае, абагульнена-ідэалізаванае ўспрыманне жыццёвых працэсаў. Як і творам некаторых іншых аўтараў, ім не ставала лірычнай глыбіні, належнай узгодненасці знешняга і ўнутранага, адзінства думкі і эмоцыі. Лірычны характар выглядаў у іх паслаблена, збеднена, без разліку на шматмернасць рэчаіснасці, складанасць жыцця. Адсюль – вобразна-стылявая адналінейнасць, лозунгавая плакатнасць і рытарычнасць, абстрактная экспрэсіўнасць:

Хай нам жыве Беларусь дарагая
Сьмела да волі ідзе.
Мэты сваей хай хутчэй дасягае,
Люд свой да шчасьця вядзе.
. . . . . . . . . . . . .
Дык, брацьця, сьмела ідзём мы наперад,
Куйма адважна свой лёс!
Доўгай нядолі парвём стары нерат,
Што мохам крыўды парос [6, с. 12].
(*«Хай нам жыве...»*)

Або:

Распутай Пагоню,
Устань, рыцар слаўны!
Вазьмі у далоню
Наш гэрб, сьцяг дзяржаўны.

Акрый гэтым сьцягам
Пакутну старонку,
Ляці роўным шляхам
За воляй ў дагонку [6, с. 30].
(*«Устань, рыцар слаўны»*)

Творчасць заходнебеларускіх паэтаў-рамантыкаў, прадстаўнікоў нацыянальна-адраджэнскай лініі Л. Родзевіча, І.Дварчаніна, Я. Бартуля, У. Казлоўшчыка характарызавалася вострым драматычным канфліктам паміж асобай лірычнага героя і рэчаіснасцю, імкненнем да нацыянальнай і сацыяльнай справядлівасці і гармоніі. Вялікі і ёмісты нацыянальна-гістарычны матэрыял, гераічныя старонкі беларускага мінулага актуалізаваліся ў іх шавіністычнай палітыкай санацыі, асіміляцыі і акаталічвання, якую праводзілі польскія ўлады, ростам духоўнай самасвядомасці народа. Услаўленне нацыянальнага мінулага, натуральна, прадугледжвала адмаўленне сучаснага стану рэчаў, несправядлівасці і прыгнёту ў грамадстве. Акумулюючы ў сабе багаты героіка-патрыятычны пафас, яны сцвярджалі прынцыпы і ідэі барацьбы і няскоранасці, свабоды асобы і краю, выяўлялі надзеі на перамогу і шчасце.

У творах паэтаў нацыянальна-адраджэнскай рамантычнай лініі гістарычнае мінулае беларускага народа паўставала не ў выглядзе нейкіх канкрэтных «рэканструяваных» сюжэтаў, падзей і эпізодаў, карцін і вобразаў. Прадстаўнікі гэтай стылявой лініі звярталіся да яго ў кантэксце прасторава-часавага суаднясення, якое прадугледжвала пераемнасць самой нацыянальнай генетычнай памяці, гераічнага духу продкаў, ідэі няскоранасці і супраціўлення. Яны малявалі нацыянальна-гістарычнае мінулае ў міфалагізавана-ідэалізаваным абліччы, не ў саслоўна-класавай дыферэн-

цыяцыі і звязаных з ёю грамадскіх супярэчнасцях і канфліктах, а як узор належнай дзяржаўна-палітычнай арганізацыі, сацыяльна-прававога ўрэгулявання, характэрнай адаптаванасці свабоды выбару і неабходнасці абавязку чалавека.

Творчасці паэтаў духоўна-ірацыянальных памкненняў таксама быў уласцівы характар апазіцыі заходнебеларускай рэчаіснасці з яе грубай эмпірычнасцю і ўтылітарызмам, несправядлівасцю і прыгнётам. Аднак сацыяльна-гістарычная абумоўленасць жыцця цікавіла іх у значна меншай ступені, чым прадстаўнікоў папярэдніх стылявых плыней, а то і зусім не цікавіла. Ідэйны, грамадска-палітычны аспекты імі фактычна не распрацоўваліся. Прадстаўнікі гэтай плыні К. Сваяк, Х. Ілляшэвіч, А. Бярозка, П. Сяўрук і інш. адмаўлялі прынцыпы падпарадкавання паэзіі і ў цэлым літаратуры і мастацтва пэўнай сацыяльнай місіі, у прыватнасці, мэтам і задачам заходнебеларускай грамадска-ідэалагічнай барацьбы, народна-вызваленчага руху, лічылі іх цалкам самадастатковай духоўна-эстэтычнай субстанцыяй і каштоўнасцю. Яны зыходзілі з таго, што мастацкая творчасць развіваецца на асновах безумоўнасці і самазаконнасці, не прадугледжвае знешніх намераў, не служыць пэўнай карысці і выгадзе. Яна знаходзіцца над рэчаіснасцю, над сацыяльнымі мэтаімкненнямі – нават самымі актуальнымі і прагрэсіўнымі, над грамадскімі інтарэсамі і запатрабаваннямі. Іх лірычны герой не прадуцыраваў сацыяльных ідэй, непасрэдна не залежаў ад грамадскага асяроддзя і не намагаўся падпарадкаваць яго сваім прынцыпам і перакананням. Ён звяртаў на сябе ўвагу характэрнай сканцэнтраванасцю на сваім унутраным суб’ектыўным свеце, які амаль не судакранаўся са светам знешняй рэчаіснасці, але быў уключаны ў прастору вялікага касмічнага цэлага. Галоўную задачу ён бачыў у сцвярджэнні высокага духоўна-эстэтычнага пачатку і разглядаў сацыяльнае асяроддзе як умову і крыніцу паўнакроўнасці ўспрымання жыцця, душэўна-псіхалагічнай раўнавагі і гармоніі.

Свету сацыяльнай і нацыянальнай несправядлівасці і прыгнёту паэты гэтай стылявой плыні супрацьпастаўлялі ідэі духоўна-маральнага ўдасканалення чалавека і грамадства. На іх думку, рэальная сіла і задача мастацтва заключаюцца ў тым, каб прасвятляць і пераўтвараць жыццё на асновах праўды і міласэрнасці, цярпення і згоды, цеплыні і спагады, любові і ўсёдаравання як праяў боскай наканаванасці чалавечай душы. Яны разглядалі мастацкі твор не як сродак дасягнення пэўнай мэты, а як саму мэту, існаванне прыгожага ў прыгожым, арэол анталагічнай тайны, асвечанай інтуіцыяй.

Духоўна-ірацыянальная стылявая плынь заходнебеларускай паэзіі сцвярджала салідарнасць усяго існага, асновы і прынцыпы станоўчага ці ідэальнага ўсёадзінства як гармонію быцця і свету, дзе кожны кампанент існуе ў сістэме шматлікага многага, у бессвядомым імкненні да суладнасці і ўзгодненасці ўсяго з усім. Яго ўтварае ўзаемазвязанасць усіх космаэвалюцыйных працэсаў, узаемапранікненне астральнага, трансцэндэнтнага, прыродна-біялагічнага, сацыяльна-гістарычнага і духоўна-чалавечага пачаткаў, якія збіраюць сусвет у адзінае цэлае, абумоўліваюць у ім месца асобы. Тут дабро прадугледжвае існаванне зла як рэальнага суб’екта і дзейнай сілы ў сістэме ўсеагульнай раўнавагі. Яно не перамагае зло, а паслядоўна авалодвае ім, падпарадкоўвае яго служэнню сваім інтарэсам і каштоўнасцям. Чалавек і прырода па-сапраўднаму могуць выявіць і сцвердзіць сваю зместавую сутнасць толькі ў суаднесенасці з усёй паўнатой і разнастайнасцю станоўчых і свабодных ідэй святла і дабра, Вышэйшым сусветным сэнсам. Мастацкія пошукі прадстаўнікоў гэтай плыні вызначаліся наяўнасцю характэрнай духоўна-інтэнцыянальнай эмоцыі, якая акрэслівала модус існавання лірычнага героя праз адметнае сінтэзаванне свету натуральных бачнасцей і адчуванняў як стыхіі абсалютнай усеагульнасці, матэрыяльнага універсуму і творчай суб’ектыўнасці.

Асноў містычнага эвалюцыянізму ў поглядзе на жыццё чалавека і грамадства прытрымліваўся Вінцук Адважны (сапр. – Язэп Германовіч, 1890–1978), паводле слоў А. Станкевіча, «арыгінальны і даволі плодны беларускі пісьменьнік і паэт» [9, с. 85], які вёў свае мастацкія пошукі, у многім арыентуючыся на духоўна-эстэтычны вопыт аднадумцы і сябра К. Сваяка, хоць і ў прыкметна іншай стылявой манеры. Яго лірычная свядомасць таксама была звернута да хрысціянскай першакрыніцы, сцвярджэння ідэальнага пачатку свету, услаўлення веры ў Бога як бязмежнае і вечнае Дабро і Шчасце. Пра гэта сведчаць вершы, сабраныя ў зборніку «Беларускія цымбалы», які выйшаў у 1933 годзе.

Як і К. Сваяк, В. Адважны зыходзіў з таго, што сусвет уяўляе сабою ідэальнае ўсёадзінства, якое арганізуецца і забяспечваецца раўнавагаю і салідарнасцю яго ўнутрана самадастатковых і адначасова ўзаемазвязаных і ўзаемазалежных складальных частак і элементаў. Рэалізуючы сваю

зместаўую сутнасць у свабодным і гарманічным суіснаванні, ва ўзаемнай спраецыраванасці і абумоўленасці, усе яго з'явы і працэсы, прадметы і рэчы падпарадкоўваюцца высокаму духоўнаму сэнсу, сведчаць «станоўчую ўсёпранікальнасць», характэрную дасканалую сабранасць. Мы бачым, што думка і перажыванне паэта вынашаныя, абгрунтаваныя, пранікнёныя:

На ўсё свой час. Бог сьвет устроіў
І так яго для нас прыкроіў,
Што жыць разумна лёгка дужа,
Бо чалавеку сьвет тут служа.

А людзі – проста няпрытомны!
На мудрасьць Божую няпомны:
Законаў Божых не пазналі –
На свой капыл перапраўлялі [3, с. 19].

У вершы В. Адважнага «Ліпень», які сцвярджае багацце і разнастайнасць, паўнату жыцця, шматлікія з'явы і прадметы рэчаіснасці таксама функцыянуюць па прынцыпу: усё цэлае – для мяне і я – для ўсяго цэлага. Разам з тым твор увасабляе ідэю адзінства і дамінуючай ролі святла і вады ў прыродзе і сусвеце, што арганізуюць сувязь неба і зямлі, духоўнага і матэрыяльнага, з'яўляюцца носьбітамі жыццядайнага і эстэтычнага пачаткаў, забяспечваюць прадуцыраванне і развіццё дабра, ісціны і красы. Пасля цёплага ліпеньскага дажджу з громам і маланкамі выглянула сонца:

Перастаў злавацца –
Стаў Ільля сьмяяцца:
Выпусьціў вясёлку.
Расхіліліся кветкі,
Разгуляліся дзеткі,
Разляталіся пчолкі.
Ўсё кругом сьмяецца,
А мне так здаецца –
Траўка радасьць чуе.
Сонца з неба скоча,
Рэчанька ласкоча,
Твар вады цалуе [3, с. 22–23].

Прыродны свет, грамадскае асяроддзе ўспрымаюць уздзеянне святла і вады, у якой, паводле слоў У. Салаўёва, «матэрыяльная стыхія ўпершыню вызваляецца ад сваёй коснасці і непранікальнай цвёрдасці» [241, с. 47–48], пераўтвараюць іх унутраную энергію, жыццяносную сілу і атрымліваюць паступальны рух да якаснага абнаўлення:

Ўжо прагнана ліха,
Сонца сходзіць ціха
Да зямелькі ў сваты.
Птушкі распяяліcь,
Людзі адазваліcь –
Ўжо пяюць дзяўчаты.
Там і тут вясёлкі:
Дзеткі, як анёлкі,
Ходзяць серад збожа.
А зямелька шчасна,
А прырода красна –
Божа, добры Божа! [3, с. 23].

Гэта той выпадак, калі «ўся прырода нібы гаворыць з чалавекам на даступнай яму мове сімвалаў, апавядаючы аб красе, якая больш за яе саму, якая ёсць у замежнасці і павінна быць чаканаю на зямлі» [80, с. 14]. Будучы сусветна-гістарычнаю асноваю, увасабленнем дабра, ісціны і красы, Дух, сіла Божая, нязменна прысутнічае ў чалавечым грамадстве, прыродзе і сусвеце, прыдае ім мэту, сэнс і значэнне, арганізуе жыццядзейнасць малога і вялікага, прыватнага і агульнага. У сваю чаргу яны самі валодаюць здольнасцю да актыўнага прадуцыравання і развіцця, бо падуладныя ўніверсальнаму закону быцця, бессвядома адлюстроўваюць унутраную логіку сусветнага цэлага.

В. Адважны сцвярджаў духоўна-маральную напоўненасць чалавечага жыцця, выступаў за тое, каб сацыяльныя і нацыянальныя праблемы і супярэчнасці заходнебеларускай рэчаіснасці вырашаліся сілаю дабра і праўды, пераканання і справядлівасці. Грамадскаму злу, граху і насіллю, канкрэтным людскім бедам і няшчасцям, на яго погляд, могуць і павінны супрацьстаяць душэўная цеплыня, усёдараванне і ўсёпрымірэнне. В. Адважны ўслаўляў цяжкую духоўна-маральную працу чалавека па ўвасабленні вобраза Божага, распаўсюджанні і ўмацаванні ў матэрыяльна-прыродным свеце пакоры і цярпення, любові і веры. Супрацьстаючы волі інстынктаў і выпадковых здарэнняў, яны, на думку паэта, уплываюць на законы фізічнага жыцця людзей, адухаўляюць іх прыродную сутнасць, рэгулююць паводзіны і ўчынкі, а ў цэлым прасвятляюць грамадскае асяроддзе, насычаюць яго маральным зместам, прыдаюць яму ўнутраную цэласнасць. Любоў і вера не проста прадугледжваюць наяўнасць выразнага душэўна-пачуццёвага стану чалавека, яго эмацыянальна-псіхалагічную зараджанасць, а сведчаць пра пэўную перадыслакацыю ўнутранага «я» асобы на аб’ект ці аб’екты знешняга свету, выяўляюць адчуванне і бачанне іх асаблівых рыс і ўласцівасцей. Усё гэта знайшло сваё ўвасабленне ў такіх вершах В. Адважнага, як «Прарок», «Сірата», «Мудрасць Саламона» і іншых, прасякнутых рэлігійна-паэтычным сімвалізмам.

Лірычны герой верша «Прарок» з зямлі «быў узнесен на вышыны», туды, «гдзе пануюць серафіны», над якімі толькі Бог Усемагутны. Там ён убачыў, як яны стаялі «з паклонам ніж – глыбокім, Закрыўшы вочы», «Прад Божым тронам» і спявалі «песьню бязупынна: «Сьвяты, сьвяты, сьвяты навекі!» Апынуўшыся ў нязвыклай для сябе сітуацыі, лірычны герой паэта «маўчаў, як пень – нямова, Ня мог сказаць разумна слова». І тады Бог «Даў знак анёлу – серафіну» ратаваць неразумнага «дзяціну»:

Й анёл ўзяў вуголь аўтарны
З агня, што там гарэў ахвярны,
І тым вуглём гаруч – гарачым
Язык мне чысьціў, вусны значыў.
І бачыў Бог – сьвяты навекі!

І стаў я чысты, стаў вясёлы,
І рады ўсе былі анёлы,
І прынялі мяне за брата:
Было з таго у небе сьвята –
І бачыў Бог – сьвяты навекі! [3, с. 9–10].

«Слабы і цёмны і пахілы», лірычны герой В. Адважнага праходзіць ачышчэнне і ахрышчэнне «Агнём нябесным» і самаахвотна выклікаецца ісці «на сьвет нікчэмны», «да таго народу, Што у грахох згубіў свабоду…» «Благія, цёмны тыя людзі, – разважае ён, – Але браты мае аднакжа – Там кроў мая жывая такжа»:

«Ідзі!» мне кажа: «пасылаю;
Я тваю слабасьць добра знаю:
Ты маей сілай будзеш сільны,
Ты маей праўдай – непамыльны…»
Сказаў мне Бог – сьвяты навекі!

Лірычны герой паэта вяртаецца на зямлю і з гонарам і адказнасцю выконвае высокую місію, ускладзеную на яго Богам. Ён прасвятляе жыватворнай боскай ідэяй людскія душы і сэрцы, выкараняе з грамадскай рэчаіснасці грэх і зло, эгаізм і пыху ўздзеяннем дабра, веры і любові, імкнецца да таго, каб яны трывала ўвайшлі ў свядомасць сучасніка, авалодалі яго ўнутраным светам:

Я скалы цьвёрдыя пакрушу,
Я сэрцы гордыя прымушу
Пазнаць ўсю праўду Божу з неба:
Што трэба нам, чаго ня трэба!
Сьвяты мой Бог – сьвяты навекі! [3, с. 11].

Паэт схіляецца да думкі, што сапраўдным жыццё на зямлі становіцца тады, калі яно насычаецца глыбокім духоўным зместам, падуладна Найвышэйшай волі, касмічнаму розуму, калі чалавек звяртаецца ў пазамежнасць, да Бога. Толькі пры гэтай умове ён набывае магчымасць

усвядоміць і зразумець рэальны стан з’яў і рэчаў, спасцігнуць таямніцу таямніц, адвечную загадку быцця, цудадзейнай сутнасці сусвету.

У нечым блізкім да папярэдняга з’яўляецца верш В. Адважнага «Сірата». Яго лірычны герой у раннім узросце, калі быў «яшчэ хлопчык маленькі», застаецца без бацькоў, «Адзін – як той колас у полі, Адзін – для гаротнае долі…» Чуйны і гарманічны, ён хінецца да людзей, шукае ў чалавечым асяроддзі «душы сабе роднай» і не знаходзіць. Яму не рады сваякі, яго, жабрака, праганяюць дзеці, крыўдзяць пастушкі, дзяўчына, з якою ён звязваў свае надзеі на ўзаемнае каханне і шчасце, «Ад сэрца… адарвана», «другому аддана». Напоўніцу зведаўшы сіроцкага хлеба, крыўды і прыніжэння, здзеку і гора, лірычны герой паэта вырашае ісці «на службу да Бога», туды, «Гдзе творыцца духа багацце». Якраз у веры ў Бога ён становіцца свабодным, самадастатковым і шчаслівым. «Тут мне адчынілася неба, – чытаем у вершы, – А сэрца, як сьлёзы тут чыста, А Богам душа прамяніста: Чаго-ж мне, чаго яшчэ трэба?» [3, с. 16]. Бог дае яму магчымасць звярнуцца да свету, які глуміцца над вераю, крыжуе Бога («Ты лжэш! лжэш ад веку да веку – Ганебна сіротак марнуеш!»), да людзей, сваіх кроўных братоў-беларусаў («Вы праўды, вы цноты шукайце, Руку сіраціне падайце – Паўстане так доля народна»). Ён стаў «клікаць да згоды», «Бо згода – найбольша багацьце, Бо згодай стаяць ўсе народы»:

У нашых у сэрцах пакутных
Ёсьць сіла гартоўнае сталі;
Мы столькі ўжо гаравалі! –
Ёсьць сіла у плечах магутных.
Ёсьць сіла у працы, у згодзе…
Зямля, хоць і шэра, нам родзіць
І шчыры труды нагародзіць –
Ёсьць сіла у нашым народзе.
Каб мы ператалі сварыцца,
Зямля больш радзіла-б нам хлеба,
Паўней зарабілі-б на неба,
Каб мы захацелі здружыцца [3, с. 16].

Натхнёная праца лірычнага героя В. Адважнага прыносіць свае вынікі: дух авалодвае чалавечай свядомасцю, вядзе да змен і зрухаў у шырокім грамадскім асяроддзі. Неўзабаве перад ім разгортваецца рамантычна-ўзвышаная, ідэалізаваная, поўная глыбокага сімвалічнага зместу карціна:

Вось брат мой – душою адроджан –
Падаў руку брату другому;
Той слабаму даў, той старому:
Народ паўстае адмалоджан.
Сіроты знаходзяць апеку,
Удовы – належну апору,
Слабыя – у моцных падпору:
Знайшлася душа ў чалавеку [3, с. 17].

«Народ стаў аднэй грамадою», а гэта прывяло да таго, што з ім пачалі лічыцца чужынцы, пачалі разумець і паважаць яго інтарэсы і каштоўнасці блізкія і далёкія суседзі. «У братняй сям’і міжнароднай, – чытаем у заключнай частцы верша, – Мы сталі усім пажаданы… Мы цешымся доляй свабоднай!» [3, с. 17].

Грамадзянска-патрыятычны ідэал звязваўся ў свядомасці В. Адважнага з рэлігійным ідэалам, Праўдай Божай, верай Хрыстовай. Як адзначаў А. Станкевіч у прадмоўным крытычным нарысе да зборніка «Беларускія цымбалы», менавіта з «несьмяротных ідэалаў Хрыстовай рэлігіі і этыкі» ён «чэрпае поэтыцкае натхненьне, да іх кліча народ свой і ў іх бача непарушную веру ў поўнае зьдзейсьненьне беларускіх народных ідэалаў, бо справа народная ў В. А. гэта частка справы Божай» [3, с. XIX]. «Даўно мы запалі у летарг глыбокі. Дарэмна будзілі нас Божы прарокі, – пісаў В. Адважны ў вершы «Народ беларускі…» «– Нам праўду казалі – мы праўды ня чулі. Нам ў вочы сьвяцілі, ад веку мы спалі, Сваіх-жа прарокаў яшчэ не пазналі…» [1, с. 36]. Абяздолены і прыгнечаны беларус-селянін, у якога «Ад працы, ад гора ўжо сьцёрліся сілы…», пакутліва б’ецца «на полі цярністым, На полі ад веку благім, камяністым» без асаблівага спадзеву на плён і вынікі

сваіх клопатаў і намаганняў. Выйсце з гэтага няпростага становішча паэт бачыў у духоўным адзінстве, паяднанні канкрэтнай асобы і народнай масы ў любові і веры ў Езуса Хрыста на глебе ўзаемапавагі і ўсёдаравання. Адраджэнне-ўваскрасенне Беларусі адбудзецца ў адпаведнасці з Провідам Божым, на шляху да святой праўды і справядлівасці, ахвярнага цярпення і міласэрнасці. Менавіта таму ён заклікаў:

Народ беларускі ўсё чэзьне, гібее…
Прыйдзі, Хрысьце Божа, Ты наша надзея!
Народ губіць розум, зракаецца волі!
Народ, што ня бачыў свабоды ніколі;
Народ, што адбіўся ад праўды, ад шчасьця;
Народ, што век плача, ня ўмее сьмяяцца,
Ніколі ня можа да дзела прыбрацца –
Папасьці на сьлед сваей долі ня можа… [1, с. 36].

Разглядаючы паэзію В. Адважнага ў згаданым крытычным нарысе, А. Станкевіч заўважаў: «Рэлігійны элемент у «Цымбалах» займае выбітнае і цікавае мейсца – ён для песьняра зьяўляецца – хоць на выгляд займае скромнае месца – першым і апошнім пунктам апоры, нягаснучым сьвятлом, у блеску якога ён піша і снуе свае разважаньні аб жыцьці беларускім. Гэта на вершах В. А. кладзе асаблівы адпячатак суцэльнасьці, супакою, жыцьцёвай мудрасьці – бяз таго мучэньня, якім адзначаюцца вершы Каз. Сваяка» [3, с. XVII]. У сувязі з дадзеным слушным заключэннем варта падкрэсліць, што ў адрозненне ад творчасці К. Сваяка, у якой дамінавалі духоўна-філасофскі, рэфлексіўны пачатак, скіраванасць на выяўленне драматычнага свету асобы, ідэйна-мастацкія пошукі В. Адважнага вызначаліся большай сацыяльнай заангажаванасцю, звернутай да пэўных праблем і супярэчнасцей рэчаіснасці. Паэт ішоў шмат у чым ад факта, падзеі, з'явы, аддаваў перавагу непасрэднаму руху думкі і перажывання, яго вобразныя абагульненні нярэдка мелі лірыка-апавядальны, публіцыстычны, сатырычна-выкрывальны характар. Дарэчы, у многіх сваіх вершах В. Адважны абмяжоўваўся традыцыйнымі для беларускай літаратуры матывамі і вобразамі, простымі, а часам і спрошчанымі сюжэтна-тэматычнымі калізіямі, мастацкая вартасць якіх прыкметна зніжалася рытарычнай дэкларацыйнасцю і дыдактычнасцю, эстэтычнай нявыверанасцю.

Творчыя пошукі Алеся Дубровіча, Уладзіслава Казлоўшчыка і Вінцука Адважнага – прыкметная з'ява літаратурнай гісторыі Заходняй Беларусі. Яны былі звернуты да раскрыцця актуальных праблем і супярэчнасцей заходнебеларускай рэчаіснасці, раскрывалі характэрныя асаблівасці духоўна-сацыяльнай свядомасці беларускага народа на адным з самых складаных этапаў яго гістарычнай жыццядзейнасці па шляху да дзяржаўнай незалежнасці і суверэнітэту.

## Спіс выкарыстаных крыніц

1. Адважны, В. Народ беларускі... / В. Адважны // Беларускі каляндар на 1933 год. – Вільня: [Б. в.], 1933. – С. 36.
2. Бельскі, М. Ён прыйшоў у сінязорны край: да 60-годдзя Алеся Дубровіча / М. Бельскі // ЛіМ. – 1966. – 8 ліп. – С. 3.
3. В. А. Беларускія цымбалы: з крытычным нарысам Ад.Станкевіча аб жыцьці і творстве В. А. / В. А. ; выд. Беларус. інстыт. гаспад. і культуры. – Вільня: [Б. в.], 1933. – 72 с.
4. Вяртанне да сваіх: Станіслаў Грынкевіч, Франук Грышкевіч, Уладыслаў Казлоўшчык / Беларускі саюз у Рэчы Паспалітай. – Беласток: [Б. в.], 1999. – 190 с.
5. Дубровіч, А. – Гэй, віхор шырокакрылы... / А. Дубровіч // Калосьсе. – 1938. – Кн. 4. – С. 224.
6. Казлоўшчык, Ул. Шляхам змаганьня: зборнік вершаў / Ул. Казлоўшчык; выд. «Новага шляху». – Вільня: [Б. в.], 1935. – 64 с.
7. Ростані волі: з заходнебеларускай паэзіі. – Мінск: Маст. літ., 1990. – 416 с.
8. Станкевіч, Ад. Аб жыцьці і творстве В. А. (Вінцука Адважнага) / Ад. Станкевіч // В. А. Беларускія цымбалы: з крытычным нарысам Ад. Станкевіча аб жыцьці і творстве В. А. / В. А. ; выд. Беларус. інстыт. гаспад. і культуры. – Вільня: [Б. в.], 1933. – С. III–XIX.
9. Станкевіч, Ад. Беларускі хрысьціянскі рух (Гістарычны нарыс) / Ад. Станкевіч; выд. «Хрысьціянскай Думкі». – Вільня: [Б. в.], 1939. – 272 с.

## References

1. Advazhny V., "Belarusian people ...", *Belaruski kaliandar na 1933 god* [Belarusian calendar 1933], Vilnia, LT, 1933, p. 36.
2. Belski M., "He Came to the Country with Blue Stars: To Ales Dubrovich's 60th Anniversary", *Litaratura i mastatstva* [Literature and Art], 1966, July 8, p. 3.
3. Germanovich Ia., *Belaruskiia tsymbaly : Z krytychnym narysam Ad.Stankevicha ab zhytstsi i tvorchastsi V. A.* [Belarusian Cymbals: A Critical Essay of Ad. Stankiewich about the V. A.'s Life and Creative Work], Druk im.Fr.Skaryny, Vilnia, LT, 1933.

4. *Viartanne da svaikh : Stanislaў Grynkevich. Franuk Gryshkevich. Uladyslaў Kazloўshchyk* [Return: Stanislau Grynkevich, Franuk Gryshkevich, Uladyslau Kazloushchyk], [Belarusian Union in the Polish-Lithuanian Commonwealth], Bialystok, PL, 1999.

5. Dubrovich A., "Hey, the Vortex with Wide Wings...", Kalos'se [Ears], 1938, Book 4, p. 224.

6. Kazloўshchyk Ul., *Shliakham zmagannia: zbornik vershaў* [By Fighting: Collection of Poetry], Novy Shliakh, Vilnia, LT, 1935.

7. *Rostani voli: z zakhodnebelaruskai paezii* [Crossroads of Freedom: from the West-Belarussian Poetry], Mastatskaia Litaratura, Minsk, BY, 1990.

8. Stankevich Ad., "The Life and Creative Work of VA (Vintsuk Advazhny)", in Germanovich Ia., *Belaruskiia tsymbaly : Z krytychnym narysam Ad.Stankevicha ab zhytstsi i tvorchastsi V. A.* [Belarusian Cymbals: A Critical Essay of Ad. Stankevich about the V. A.'s Life and Creative Work], Ed. Belarusian Institute of Economy and Culture, Vilnia, 1933, III, XIX.

9. Stankevich Ad., *Belaruski khrys'tsiianski rukh (Gistarychny narys)* [Belarusian Christian Movement (Historical Review)], Khrystsiianskaia Dumka, Vilnia, LT, 1939.

## Информация об авторе

**Микулич Николай Владимирович** – кандидат филологических наук, доцент, заведующий отделом взаимосвязей литератур. Центр исследований белорусской культуры, языка и литературы НАН Беларуси (ул. Сурганова, 1, корп. 2, 220072, Минск, Республика Беларусь). E-mail: mikmik43@gmail.com

## Information about the author

**Nikolai V. Mikulich** – Ph. D. (Philol.), Associate Professor, Head of the Department of Literature Interrelations, Belarusian Culture, Language and Literature Research Centre, National Academy of Sciences of Belarus (1 Surganov Str., Bldg 2, Minsk 220072, Belarus). E-mail: mikmik43@gmail.com